Цэна асобнага нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень.

Адрэс рэдакціі і адміністрацыі: **Вільня, Віленская вул., № 29.**

Цэна с перасылкай і дастаўкай на 1 г.—2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За граніцай: на 1 г.— 4 р. на 6 мес.—2 р. 3 мес.—1 р. Перамена адрэсу— 20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі Рукапісы і карэспандэнціі, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ падпісаць прозвішчэ разам с фаміліей,, хто на захочэ каб была надрукавана праўдзівая фамілія. Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакціі. Рэдакція пакідае за сабой права папраўляць і укарачываць прысланые рукапісы і аўторам назад іх не звертае.

Год X. | 19 Марца 1915 г. | № 11

**Ад рэдакціі.** *С прычыны сьвята чародны нумэр «Нашае Нівы» выйдзе 2 красавіка.*

## На Вялікдзень.

Сярод цёмнае ночы, а поўначы глухой, з грудзей сьвятынь, будаваных с каменя, ударуць званы і разнясуць радасную вестку хрысьціянам:

Хрыстос уваскрос!

Уваскрос ласкавы Бог!

Уваскросла забітая, за праўду, спрадвечная Праўда, ўваскрос Бог любові.

І гук званоў Вялікодных тысяча дзевяцьсот пятнаццаты раз павесьціць хрысьціянскаму сьвету Яго завет:

Любіця бліжніх!

Любіця бліжніх!

Палыне гул званові па сёлах, па вёсках, праз узлескі, на шырокае поле, — палыне завет Яго:

Любіця бліжніх!

У цёмным бару, у нетрах пушч гул перакоціцца...

Праз аконцы бедных хацінак ўплыве голас званові разам с першымі праменямі яснаго сонейка, каторае асьвеціць недастаткі, беспатолю, злыбеду...

Хрыстос ўваскрос!

Любіця бліжніх!

А спыніцца гул трыумфальны ў чырвоных ад крыві туманах, перад полем засланым пабітымі. Замрэ і змоўкне. Не пасьмее там вялікі звон прагугнавіць далейшы завет Яго:

І ворагоў вашых!

**Ю. В.**

## Вялікодные думкі.

Вылеці, сізая галачка,
Вынясі залаты ключы,
Замкні халодную зімачку,
Адамкні цёплае летачко.

*Народная.*

Хрыстос уваскрос!

Трэба «гукаць Вясну» з жалейкамі, с песьнямі, с карагодамі.

Прачніся, маці Зямліца, выпусьці на волю Травіцу! А ты, Весна-Вясніца, накармі быкоў, наладзь саху і барану, бо хлебаробу трэба выйсьці на поле, на свой шнур!

Хрыстос уваскрос!

Селянін выяўляець сабе Уваскрасеньне Хрыстова неадлучна з уваскрасеньнем Вясны, калі жаўранкі гучна кажуць свае малітва-песьні над чорназёмным полем, калі маладзенькая травіца на выгане паказываецца, калі сонейка сьветлае пачынае старанна грэць Божы сьвет і на душы гарапашніка робіцца весялей...

Хрыстос уваскрос!

Трэба мужыку ўзяцца за працу. Вада шуміць у рэчцы. Пралесачкі пад кустамі цьвітуць. Гэй, людцы добрые, ці чуеця!

Чаму вы апусьцілі свае галаванькі? Чаму сум-туга сэрцэйкі сашчаміла? Чаму па вёсках так ціха, жудасна? Чаму не раздаецца зычная песьня валачобная? Чаму плачы-прычытаньні чуюцца па цэлых ваколіцах? Чаму гэткіе цёмные хмары атулілі нашэ сьвято адраджэньня Зямліцы-маці?

Бо Земля-маці сыціцца крывёю і касьцьмі людзкімі, грэіцца пажарамі сяліб і гарадоў, сеіцца волавам і жалезам... Замест бараны і сахі людзі гарматамі і стрэльбамі працуюць...

І німа той сям'і, дзе не было-бы недалічкі якога: сына, бацькі ці брата...

І німа той хацінкі, дзе не бедавалі-бы, хто будзе на гэта летка шнур апрацовываць...

— Хрыстос уваскрос!—кажуць людзі па прывычцы сваёй, але вочы іх не з'яюць ад дабраты шчырай, і сэрцы іх не радасны, бо шчыміць-мучыць боль пытаньняў вялікіх:

Калі уваскрэсьне Хрыстос ня толькі на вуснах людзкіх, але і ў іх душах і сэрцах? Калі прыдзе Весна Духа людзкога? Калі заз'яець над людзьмі Сонцэ любові і шчырасьці? Калі людзі перэстануць прычыняць адны адным нешчасьці сьмяротные? калі жыцьцё на зямлі засьпевае гымн сьветлай бязмежнай Згоды? Калі людзі шчыра будуць казаць: „Хрыстос ўваскрос?..“

**Я——р.**

## Людзкіе дарогі.

(С «Сымона Музыкі»).

I

Гэй дарогі ў чыстым полі,
Ніці шэрые зямлі!
Колькі к долі і нядолі
Ног людзкіх вы пранясьлі!,
Выйшла-б казка, ды якая,
Каб маглі вы расказаць



То, што думка не згадае,
Што адным вам толькі знаць.
І шчасьлівы той, хто з вамі
Не спазнаўся ў раньні час,
Хто не плакаў пад крыжамі,
Ў смутку стоючы не раз,
Адзінокі, паміж вамі,
Хлопатоў людзкіх ганцы,
Там, дзе бітнымі сьледамі
Бяжыцё ва ўсе канцы.

II

Эх, што можэ быць дарожай
Вольнай волечкі, палёў,
Гэтай сіней далі Божэй,
Невядомай і прыгожай,
Без канца, без берагоў?
Гэтых хмарак злататканых,
Ветра посьвіста ў палёх,
Думак сьветлых, мар незнаных
І нікому неказаных
Казак леса і дарог?
Эх, ты шыр, прастор далёкі!..
І шчасьлівы будзе той,
Хто, душою адзінокі,
Моцна злучыцца с табой.

**Якуб Колас.**

---

# Першы крок.

Ёсьць справы, аб каторых ня можэ быць ніякай споркі: яны гэтак ясны, як Божы дзень.

Да такіх спраў належыць і справа навучаньня дзяцей асноў веры і малітв у іх роднай, матчынай мові. І тые, хто працівіцца, каб дзетак беларускіх вучылі-бы па беларуску, ня мелі ніколі сьмеласьці сказаць, што гэта—*непатрэбна*: яны працівяцца законнаму жаданьню нашаго народу толькі дзеля сваей «палітыкі».

Усё, што робіцца дзель «палітыкі», павінно зьменяцца, калі зьменяецца самая гэтая „палітыка". Вось, у міністэрстві прасьветы, як настаў новы міністэр - гр. Ігнатьев, бачым новы паварот: міністэрство прызнало, што ніякая „палітыка" не павінна адыймаць у дзяцей матчынай мовы, бо без яе і навука не йдзе ў галаву. Ня дзіва: то-ж дзіцяці зусім не пад сілу зразу набірацца і новых ведамасьцей, і новых—*чужых*—слоў. У навучаньні не павінна быць мейсца для „палітыкі": тутака — поўнае панаваньне *пэдагогікі*.

На з'ездзі папечыцялёў навуковых округоў у Петраградзі паднялася была гутарка аб беларусах. Першы раз галава міністэрства, гр. Ігнатьев, закрануў беларускую справу. Ён ад'значыў, што нашы настаўнікі і вучыцялі гэтак ужо прывучэны беларускай гутаркі не лічыць за мову, а за „расейскі провінціоналізм", што і завясьці навуку каталіцкай веры для беларусоў па беларуску з імі будзе трудна. Але ўсё-ж тыкі *беларусы маюць права вучыцца рэлігіі па свойму*, і ўселякая забарона можэ толькі зрабіць з іх ворагоў Расеі.

Гэтак, як мы даведаліся ў віленскім вучэбным окрузі, казаў міністэр. І ўсе папячыцялі згодзіліся з ім.

Як будзе далей? Ці пастанова з'езду будзе споўнена і як?

Мы знаемо нашых вучыцялёў. Мы ведаем, што іх з малых дзён прывучалі да пагарды ца іх роднай беларускай мовы, прывучалі чурацца яе, бо яна «псавала» расейскую мову... У такім духу узрасталі яны, праходзілі навукі ў сэмінарыях і інстытутах для вучыцялёў і, прыежджаючы у сваю вёску, ўжо гаварылі толькі па расейску. Лёгка зразумець, як гэта адбівалася на нашых селянах, каторые памалу гублялі сваю чэлавечу гордасьць, пачалі думаць, што самі яны, іх мова, іх песьнязказка—ўсё гэта нікчэмнае, без ніякай вартасьці і цаны, што толькі тады зробяцца яны «людзьмі», калі пойдуць сьледам сваіх настаўнікоў...

Цяпер народ ужо глядзіць на сьвет Божы і на сябе цьвярозымі вачыма. Ен ужо пазнаў, што кожын мае права *быць чэлавекам*, што ўсе народы створэны не затым, каб іх нехта перэрабляў на «чужы капыл», а затым, каб тварыць сваю асобную культуру, каб развіваць усё тое — сваё, асобнае, што заложэна ў яго душу і не заложэна ў душу другіх народоў.

Першае жаданьне сьведомых беларусоў — гэта здабыць належнае мейсцо для сваей мовы у школі, ў цэркві і касьцелі. Доўга гэтаму працівіліся і школы і духавенства. Але вось цяпер, беларусам пачынаюць рабіць уступкі: дзе-не-дзе ў касьцёлах чутно слова божа па беларуску, а вось сьледам ідзе і міністэрство асьветы: яно зрабіло першы крок, каб дапусьціць нашу родну мову у школу.

Мы ведаем (як гэта сказаў і сам міністэр), што нашы «настаўнікі» будуць сперша крыва глядзець на «навіну». Але мы ведаем, што раней ці пазней і ў іх прыспаных сэрцах збудзіцца гарачая любоў да сваей забытай Маткі-Беларусі, каторая ўжо ступіла на дарогу да новаго жыцьця, да новай сьветлай будучыны!

**а—н—а.**

---

# ВАЙНА.

**На Ўсходнім фронце.** (*Тэлеграмы П. Т. А. ад Штабу Верхоўнаго Главнакамандуючаго*).

12 марца. На фронце к захаду ад сярэдняй часьні Нёману расейцы пасовываюцца па правым беразі Нарэва. На левым беразі Віслы важных перамен німа. 13 марца. Расейскае наступленьне к захаду ад сярэдняй часьці Нёману 12 марца немцы спаткалі проціатакамі. Бітвы не спыняюцца. На правым беразі Нарэва і на левым беразі Віслы без важных перамен. 14 марца. К захаду ад сярэдняй часьці Нёману, а такжэ на правым беразі Нарэва і на левым беразі Віслы 13 марца значных перамен не было 15 марца. К захаду ад Нёману 14 марца бітвы мелі характар стычак. Каля Осовца слабая гарматняя стрэляніна. У районі рэк Шквы і Омулева, на фронце Тартак—Бах—Завады адбываюцца заўзятые бітвы за пазыціі немцоў. За суткі ўзята тут 600 з лішнім палонных с 5 афіцэрамі і 2 кулемётамі. На фронце к захаду ад Нёману стрэчное наступленьне нямецкаго войска ўсюды расейцы затрымалі. Батальон 21 нямецкаго корпусу, праравўшыйся 14 марца па лёдзі возера Дуся к расейцам з заду, зністожэны атакай на штыхі непадалёк вёскі Жэбжышкі. Пад Осовцом непрыяцельскіе гарматы амаль зусім нерэсталі стрэляць. Паміж Шквой і Ожыцам бітвы адбываюцца. У найзаўзяцейшай бітве за вёску Вах расейцы захапілі 9 нямецкіх кулемётоў. 17 марца. На фронце к захаду ад Нёману бітвы не спыняюцца. 18 марца каля вёскі Струмбаглов, у 12 вёрстах к поўначазаходу ад Лодзее, астатак нямецкаго батальёну, атакаванаго расейцамі на штыхі, здаўся лікам 250 душ. На правым беразі Нарэва між Шквой і Омулевам адбываюцца ваенные стычкі за адзельные дубровы і узгоркі. Расейцы выціснулі немцоў з району вёскі Вах. П.Т.А.).

У **Галіччыні**. 12 марца. У Карпатах наступленьне расейцоў на фронці паміж напрамкамі на Бартфэльт і Ужок пашыраецца карысна. Расейскае войска ў вельмі трудных варунках узяло верх ў районі Лупковскаго перэвалу, гдзе расейцы здабылі прыступам важжную аўстрыяцкую пазыцію на глаўнай вершыне Бэскідзкіх гор. Перамогшы лясы, перапутаные калючым дротам, і нeколькі радоў акопоў, расейская пяхота падцягнулася к глаўнай непрыяцельскай пазыціі і, пасьля абстрэлу яе гарматамі, выцягнутымі на руках на далечыню 600 шагоў, прабілася церaз глыбокіе канавы і захапіла украпленьні, умацаваные ёмкімі бліндажамі і маючые ўнутрэньнюю абарону. Аўстрыякі зрабілі неколькі заўзятых атак у густых калоннах, каторые часьцю разсеяны, часьцю знiстожэны расейскімі кулямі і штыхамі. К раніцы 11 марца абазначыўся на нескольких пазыціях атход праціўніка. 13 марца. На фронце паміж напрамкамі на Бартфэльд і Ужок, не зважаючы на атрыманую праціўнікам падмогу, расейцы далей пасовываюцца. На напрамках Мункач—Стрый і Хуст — Доліна немцы ізноў безкарасна атакавалі расейскіе пазыціі. 14 марца. У Карпатах расейцы значна пасунуліся

---

# На біблійны лад.

**Ісая X.**

Сорам тым, хто пішыць дрэнные законы,
Хто на мармуры брыдоту высекаець;
Сорам тым, хто глух да сіраціных стогноў,
Хто ў нешчасных ўдоў дабыткі адбіраець.

Сорам тым, хто любіць посулы і льсьцівасьць,
Хто ўсюль разсевае благасьці насеньне;
Сорам тым, хто любіць хітрасьці і хцівасьць,
У каго на сэрцы палеглі каменьні.

Сорам тым, хто гнецца прэд нямым Ваалам,—
За гарачу страву злыдня абыймаець;
Хто для безпатольных гідкім ёсьць пужалам;
Сорам усім тым, хто сораму не маець!

**Ісая LXIII.**

Хто гэта ідзець у вопратках крывавых,
Скованы ў жалеза, ў шчытах, абручах,
Моц бязмерная у поступах, у жвавых,
Вока сакаліна наганяець страх?

Бог яго—руіна. Помста—яго сьцягі.
Сьмерць—яго зашчыта, абароны дух.
У яго грудзях бязмерная адвага,
Рушыць цэлы краі ён у прах і пух.

А на скрыдлах гневу носіцца па полю;
Сіла у грудзях—яго хмялёвы мёд;
Сэрцэ яго — Праўда і сьвятая Воля
А жаданьня мэта—родны свой народ.

**Ясакар.**

---

# „СТРАЖНІК"*).

— «Пачэкайце трошкі»,—сказала Альжбета: «вось я зараз сьпяку трохі чаго». І яна ў міг нашчэпала трэсак, паставіла на прыпяку трыножку, скавараду, прынесла кілбасу, сала; Міхалка папрасіў, каб Амільян пазваў якіх суседзяў, і цераз гадзіну ў Амільяна суседзі віталіся з Міхалкам і распытывалі пра яго жыцьцё. Альжбета прынесла ад Сарабасі яшчэ дзьве пляшкі сівой, і да самай раніцы Амільян з Міхалкам спраўлялі уходзіны.

На другі дзень, раніцаю браты пашлі на гумно абгледаць гаспадарку, а Альжбета з Волькай асталіся ў хаці. Праўда Волька шчэ спала, як Альжбета патпаліла ў печы і стала агледацца, але Максімка скора ўсіх разбудзіў. Высунуўшы галаву с-пад коўдры, ён крыкнуў: «мама!» а ўбачыўшы, што ўся хата застаўлена нейкімі моднымі штукамі, ён так моцна запеў, што Волька ажно зморшчылася. Якраз у гэту пару ў хату ўвышлі Амільян з Міхалкам. Абодвы былі вясёлые і сьмеяліся.

— «Ну паднімайся, Волька», — загаварыў Міхалка, бачучы, што Альжбета ўжо даўно працуе каля печы.

— «Трэба, трэба, нябога, прывыкаць», — дадаў Амільян: «у нас ня тое, каб рана легчы ды позна ўстаць, у нас трэба позна легчы, ды рана ўстаць».

Волька нічога не сказала, але ўсё такі ўстала і пачала прыбіраць пасьцель, а Альжбета паставіла сьнедаць.

— «Ведаеш, што, браце»,—пачаў Міхалка, сеўшы за стол: «сам ты бачыш, што калі мы будзем жыць разам, дык будзе кепска: пойдзе ў нас калатня, сварка, грыжа. Давай лепей зробім хутчэй так, як трэба: падзелімся, а тады кожны сабе гаспадар, што захочэ, дык і будзе рабіць».

Амільян толькі гэтаго й чэкаў.

— «Дзяліцца, дык дзяліцца», —сказаў ён: «сам ведаеш, што мне бацька пакінуў і што цеперака ёсьць у мяне».

— «Ўсё раздзелім папалам», — прабарматаў Міхалка і пачаў сёрбаць капусту.

— «Глядзі, Міхалючок, каб ты нас ня скрыўдзіў»,—умешалася Альжбета: «бо табе грэх будзе. Сам ведаеш, як мы тут гаравалі, а ты-ж з маленства жывеш на панскім хлебі».

Але Міхалка сядзеў насупіўшы бровы і нічога не атказаў, толькі скрыва пазіраў на брата.

— «Ну дык якжэ, браце, як будзе?»,— папытаў Амільян.

— «Я табе сказаў, як будзе. Ну што ў цябе: хата, ток, хлеў, сьвіран, конь, карова, сьвіньня, авечкі — ну вось выбірай сабе палавіну».

Скрывіўся Амільян ды толькі патыліцу пачухаў.

— «Бяры, што хочэш, — сказаў, — а калі скрыўдзіш мяне, Бог табе судзьдзя».

— «Ну то-то!»—зарагатаў Міхалка: «значыць, будзе так: табе хата, ток, конь і карова, а сьвіньня і авечкі папалам, а там усё маё. У мяне конь і карова ёсьць, а хату я сабе пастаўлю... Альжбета, ну што-ж ты маўчыш»,—абярнуўся ён да Амільянавай жонкі.

Альжбета глянула на Амільяна і, бачучы, што той галаву апусьціў, махнула толькі рухой:

— «Ніхай будзе гэтак», — сказала яна і пайшла па ваду.

Болей яны нічога не гаварылі, толькі Амільян сказаў, што калі трэба будзе, дык ён

*) Гл. „Н. Н." № 10.

у напрамку на Бартфэльд. Аўстрыякі атступаючы падпалілі вёску Зборо. На Балігродзкім напрамку расейцы захапілі умацаваную высату ад Явожэца. Каля Руске Дыдзюва і Козювкі расейцы карысна адбілі атакі нялі--кіх непрыяцельскіх сіл. У Васточнай Галіччыні расейцы аткінулі непрыяцельскі батальон, пэрэправіўшыйся цераз Днестр каля Жожавы, задаўшы яму вялікіе страты. 14 марца. У Карпатах расейскае наступленьне пашырылося найболей на Балігродзкім напрамку, гдзе расейцы з боем захапілі новую лінію высот на фронце каля 35 вёрст. У бітве на штыхі за высату 389, болей на ўсход ад вёскі Млінароч, расейцы зністоржылі 3 батальоны аўстрыякоў. У напрамку Мункач—Стрый немцы ізноў зрабілі некольні адбітых расейцамі атак, прычым безкарысна меціліся закідаць расейскіе акопы ручнымі гранатамі. 15 марца. У Карпатах паміж Горліцэ, і Бартфэльдам, аўстрыякі кідаліся 14 марца у заўзятые але безкарысные атакі каля вёскі Гладышова і Рэгетова. На Балігродзкім напрамку і на левым беразі верхняго Сану, на участку Радзеюв—Полянка—Завой—Явожэц, расейцы пасунуліся наперад. Каля Козювкі 14 марца адбіты новые атакі немцоў. 16 марца. У карпатах між Бартфэльдзкім і Ужоцкім напрамкамі расейскіе змаганьні пашыраюцца карысна Ня гледзючы на заўзятае супраціўленьне праціўніка і колькі страшэнна заўзятых проці-атак, расейцы ізноў здабылі некольні умацаваных пазыцій на высотах. Атрад праціўніка, наступаўшый ад Чэрновцоў, 15 марца прарваўся цераз расейскую границу і пасунуўся на палавіну далечыні к Хоціну. На гэта звернута належную ўвагу.

**На Каўказкім фронце** бітвы адбываюцца ў Алашкертскай даліне, ў Зачорохскім краю і ў напрамках Ольцінскім і Соганлукскім. Судзючы з вестак Штабу, нічога важнаго гэтые бітвы абядзьвум ваюючым старонам не прынесьлі.

**На Заходнім (француском) фронце**—нічога важнаго.

**На моры.** (П.Т.А.). Вечэрам 15/Ш нямецкіе параходы, падыйшоўшы к Лібаве, выпусцілі па гораду каля 200 знарадоў. У горадзі забіты адзін жыхар і адзін ранены. Страт паміж ваенна-служачымі німа. Гэтаго-ж 15 марца расейскі чорнаморскі флот абстрэліваў берэгавые форты і батарэі Босфора (пратока каля Константынополя) на абадвух берагох пратоку. Павэдлуг таго, што прыкмечана с параходоў і самалётоў, знарады кляліся добра. Расейскіе лятуны, лётаўшые над батарэямі Босфора, рабілі разведку і кідалі бомбы. Па лятунах была аткрыта сільная гарматняя і стрэльбавая стрэлянiна, не прычыніўшая шкоды. Меціўшыеся выйці ў морэ з Босфора непрыяцельскіе мінаноскі змушэны былі расейскай стрэлянінай вернуцца назад. Меціўшыйся прарвацца з мора ў Босфор вялікі чатырохмаштовы непрыяцельскі параход расейцы разстрэлялі. Выкінуўшыся на берэг ён узарваўся.

(П.Т.А.).

# На вайне і каля вайны.

**Аўстрыякі аб здачы Перамышля.** Аўстрыяцкі штаб (пробуець бараніць ваенную чэсьць аўстра-венгэрскай арміі, тлумачучы упадак Перамышля, як здарэньне, не маючае вялікаго ваеннаго значэньня.

— Пасьля $4^1/_2$ месячнаго абступу,—кажэ начальнік штабу Гэфэр,—Перамышль паў с чэсьцю. Калі запасы харчоў кончыліся, генерал Кусманэк уладзіў апошнюю вылазку. Пасьля сямігадзіновай бітвы, нашы баевые сілы, пад націскам большаго ад нас лікам ворага, былі прымушэны адступіць ад лініі фортоў. Дзеля таго, што пасьля вылазкі запасу харчоў, пры найвялікшай ашчаднасьці, аставалася толькі на тры дні, камэндант атрымаў прыказ, як скончыцца гэты срок, зністоржыць ваенные матэр'ялы, а крэпасьць аддаў ворагу. Як паведамляе лятун прыбыўшы с Перамышля, нашым удалася зністоржыць гарматы на фортах, ваенные запасы і крэпасные прылады. Гарнізон (крэпасное войска) крэпасьці заслужыў нашу любоў і прыхільнасьць за сваю вытрываласьць і адвагу, выказанную ім у апошняй вылазцы і ранейшых бітвах. Ад гэтай прыхільнасьці для яго не адмовіцца нават і вораг. Упадак крэпасьці, з якім кіраўнікі нашай арміі павінны былі лічыцца ўжо даўно, нічога сабой ня зьменіць у агульным ваенным палажэнні. Наша палевая армія далей змагаецца у Карпатах.

**Правы камэнданта крэпасьці.** Сэнат, у звязку з аднэй справай, гэтак, як паведамляе „Кроншт. Вѣстникъ“, выясьніў правы камендаиа крэпасьці:

Камэндант крэпасьці аб'яўленай нават не на асадным, але толькі на ваенным палажэньні, упаўнамочываецца ў стасунку к спакойным (не ваенным) жыхарам крэпасьці зусім асобнымі правамі, каторых не даецца яму у спакойны час. Камэнданту крэпасьці, абвешчэнай на ваенным палажэньні, можна калі трэба браць жыхароў крэпасьці і яе района на крэпасные работы і забіраць ад іх патрэбные да работы прылады і матэр'ялы, рэчы для перэвязкі раненых і запасы харчоў. Плаціць за работу і за ўсё ўзятая камэндант павінен павэдлуг устаноўленых на гэта цэнах, або выдаваць квіты. Гражданскіе (не ваенные) ўласьці пры гэтым павінны адразу і без спрэчкі выпаўняць, ўсё што камэндант ад іх вымагаець і як мага старацца, каб акуратна былі выпоўнены усе загады. Прыватные асобы, інтэрэсы каторых папярпелі ад выпаўненьні ўласьцямі задач у часе абароны крэпасьці, павінны дабівацца заплаты за свае шкоды, не ў парадку гражданскаго суду, але ў парадку адміністрацыйным.

**Замена палоннымі.** На аўстрыяцка-італьянскай границы было такое здарэньне:

Аўстрыякі старанна ўзрывалі прыгранічные скалы для ўстройства на іх фортоў (украпленьняў). Адзін італьянскі с прыгранічнай стражы салдат, зацікавіўшыся гэтымі ўзрывамі, перайшоў границу і неўспадзеўкі наткнуўся тут на аўстрыяцкаго салдата, каторы як стой схапіў італьянца за полы. Нядоўга думаючы, італьянец так сама учапіўся за полы аўстрыяка і пацягнуў яго к сабе. Трымаючы такім манерам адзін аднаго, абодва крычалі: «Ты мой палонны!» «Не, ты мой палонны!»

— «Я цябе трымаю...»

— «Не, я цябе трымаю...»

У гэтым часе італьянец, скеміўшы, што к яго праціўніку можэ падасьпець помач раней чымся к яму, адазваўся да аўстрыяка:

— Слухай, ты маеш палоннаго і я — як бачыш, маю. Давай заменяемся палоннымі с прычыны сьвята.

— А што-ж, давай!—згадзіўся аўстрыяк.

Выпусьціўшы адзін аднаго і шчыра папрашчаўшыся, „ворагі“ спакойна разыйшліся.

# З Беларусі і Літвы.

## З Віленшчыны.

**Абавязываючые пастановы** для дзьвінскаго ваеннаго округу. 1) Забараняецца прыватным асобам вывозіць за межы віленскай і гродзенскай губ. дровы. 2) Забараняецца гаварыць па нямецку у грамадзянскіх і ўрадовых установах а такжэ на вуліцах, у крамах і ва ўсіх публічных мейсцох. Так сама забараняецца выстаўляць і друкаваць што колечы па нямецку. 3) Загадываецца ўсім гандляром вясьці акуратны рахунак медзі, запісываючы купленую і праданую медзь у кнігі. Прадаваць можна толькі тым асобам, каторых знае крамнік. Віноўные ў невыпоўненьні якой небудзь з гэтых пастановоў будуць карацца або штрафам да 3000 руб., або арыштам да 3 месяцоў.

**На чыгунках.** Упраўленьне Палескіх чыгунак паведамляе, што ад 15 марца на Палескіх чыгунках пачтовые поезды усіх участкоў будуць хадзіць павэдлуг расписаньня як у спакойны час.

**У лесі**, належачым да двара Людвіково (ашмянск. пав.) гр. Г. Чапскай, лясьнік Гарадой зламіў на парубцэ селян О. Дубніка і яго сына, прычым лясьнік „няўмысна“ падстрэліў нагу сыну Дубніка. Падстрэлянаго атправілі ў бальніцу.

**Арышт.** Як паведамляе „Веч. Газ.“, у ночы на 15 марца у Вільні у друкарні „Зніч“ паліція зрабіла паміж друкарамі асабовы вобыск. Адзін з друкароў Александар Корф арыштованы.

**За падробку** рэцэпта на спірт акружны суд засудзіў на месяц у турму члена віленскаго „апе-

---

паможэ паставіць хату. На гэтым і кончылі. Амільян запрог каня і паехаў у суседнюю вёску ў краму, а Міхалка пайшоў абгледаць свае пажыткі.

III.

Пасьля Новаго году марозы сталі большые і вёска Лапцевічы, здаецца, зусім замёрла. На вуліцы ніхто нідзе не шасьне, усё жывое пахавалася, хто куды мог. Уперад, бывала, вароны ды вераб'і дык цэлымі кучамі лёталі з аднаго сьметніка на другі, а цяпер і тые недзе скрыліся.

Але ў людзей усё йшло сваім чарадом. Міхалка абзнаёміўся с суседзямі, жонка прывучылася агледацца ў хаце. Вось толькі дзеці не маглі паміріцца і кожны дзень то ў Міхалкавых, то ў Амільянавых сядзелі на лбе сіняні.

У самога Амільяна на першай нядзелі мясаеда чэкалі нават аднэй навіны—ён аддаваў замуж сваю дачку Маньку. На Вадохрышчэ зрабілі заручыны, трохі пагулялі і, каб доўга гэтаго дзела не цягнуць, цераз нядзелю думалі зрабіць вясельле. Альжбета, праўда, плакала, шкадавала Манькі, бо сама адна аставалася, але нічога-ж ня зробіш — хлопец пасватаўся харошы, багаты, чаго-ж будзеш чэкаць?

— «Ну вот і добра будзе»,—казаў раз Міхалка: «адгуляем вясельле, а пасьля возьмемся за работу. Навозім бярвеньня ды к Вялікадню можэ й зробім хату. Вот і твой зяць трохі паможэ,—на заручынах ён мне дакляраваў, што калі самому некалі будзе, дык дасьць каня».

— «Ды ўжо-ж неяк зробім», — атказаў Амільян: «свой свайму чаму не памагчы. Толькі вось, браце, ў мяне грашэй малавата на вясельле,—калі ў цябе ёсьць, дык ты пазыч мне рублёў дваццаць».

Міхалька кіўнуў галавою, выняў с палярэсіка дваццаць пяць рублёў і даў брату.

— «Аддасі як будуць»,—сказаў.

Тым часам назначэны дзень падыйшоў скора і ў Амільяна ў хаце было чыстае пекла. Альжбета мыла падлогу, пабяліла сьцены, печ; Манька з дзеўчатамі шыла на шлюб, бабы пяклі каравай. Волька памагала Альжбеце, Амільян наладжываў паўкошак. Адным словам кожнаму была работа, і толькі, як запелі першые пявуны, тады трохі прыбраліся; суседзі пайшлі дамоў, а Касапузенкі паляглі спаць.

На заўтра, ў нядзелю, у Амільяна, як водзіцца, было цэлае зборышчэ, прост, носа не было дзе ўваткнуць. Назьбіралася хлапцоў, дзеўчат; бабы пелі песьні, ў запяку крычэлі дзеці, музыкі ад'жаварывалі Лявоніху; нарабілі стуку, гоману, крыку. Альжбета адна ледзьве упраўлялася: там трэба прынясьці, там прыняць, там трэба папрасіць, бо ведама-ж, як бывае на вясельлі. Міхалка трохі патпіў і пайшоў скакаць, за ім—сват с сваццяй. Нават Альжбета і тая ўзялася ў бокі і, як той кажэ, «козырам» патхапіла пад рукі свата, так што і маладые гэтак ні аддрапятавалі, як яны.

— «Вот люблю сваццьцю» — засьмеяўся сват. «Вот скакуха, дык скакуха, проста, як на спружынах ходзіць! Лепей, як маладая».

— «Эх, сват», — умешаўся сюды сусед Янка: «яна маладая была першая дзеўка ў вёсцы, а як ішла за Амільяна замуж, дык, далібог, я плакаў».

— «От... маўчаў-бы ўжо лепей, знашоў, што ўспамінаць»,—засьмеялася Альжбета і папхнуўшы Янка у плечы, пашла ў кухню, а пасьля стала прыймаць са стала, бо людзі, тым часам, з-за стала ўжо павылазілі.

Маладые пашлі спаць, старые хто пашоў дадому, хто хадзіў па дварэ, а рэшта была ў хаці,—глядзелі, як гулялі хлопцы і дзеўчаты. Волька з Альжбетай пароліся ў кухні, Міхалка лёг спаць, бо яго ногі пачалі выкручываць абаранкі, а нос усё нешта дзёўбаў; а Амільян пашоў даваць каровам і каню.

Пасьля вечэры сталі сабірацца ад'жджаць да маладога. Сабралі ўсё, што трэба было, Манька папрашчалася з раднёй, і, трохі пачакаўшы, хата Амільяна зноў апусьцела; асталіся толькі Міхалкавы ды Амільянавы дзеці і суседка Марыля, Янкава жонка, а тые ўсе паехалі да маладога.

Цераз два дні вясельля скончылося, і ў Амільяна зноў усё пашло сваім чарадом. На пятай нядзелі мясаеда пашоў сьнег і стала водліж, бо тым часам ужо й пара была — да вялікаго посту аставалася толькі дзьве нядзелі, а там што, там ужо сьнег пачне раставаць. Міхалка хацеў ехаць купляць бярвеньня на хату, але да Ўласа не сабраўся, а там пашоў дожд, дарога сапсавалася і ён так і думаць пакінуў аб новай хаці.

— «Трэба ўжо да вясны жыць як небудзь», — казаў ён, — «бо ўсёроўна цяпер да Вялікадня нічога ня зробіш. А там як абсеімся, дык тады ўжо будзем глядзець, што рабіць, а да Вялікадня ўжо будзем разам жыць».

Але не прышлося ім разам жыць ня толькі да Вялікадня, але нават і ў вялікі пост.

«Каб ведаў дзе паваліўся, дык-бы лепей узяў ды сеў», кажуць нашы людзі, — яно й праўда: здаецца, што добра зробіш, а яно выходзіць зусім кепска.

**С. Бірыло.**

(Далей будзе).

